Падтрымай "Вясну" на PATREON

26 снежня - больш за 15 судоў над удзельнікамі акцый у падтрымку незалежнасці фота дапоўнена

26.12.2019 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў

26 снежня ў Беларусі пачынаюцца суды над удзельнікамі масавых акцый у падтрымку незалежнасці, якія адбыліся ў Мінску 7 і 8 снежня. На гэты дзень запланавана больш за 15 судовых пасяджэнняў.

ПЦ "Вясна" будзе абнаўляць інфармацыю пра іх вынікі.

Каго мусяць судзіць 26 снежня?

Аляксей Прохараў (Віцебск), складзены пратакол па частцы 1 артыкула 23.34 КаАП (за заклікі ў інтэрнэце да ўдзелу ў "жывым ланцугу"). Суд Віцебскага раёна, 11.00. Суддзя - **Міхаіл Зубеня**. Вынік - **5 базавых велічынь штрафу (127,5 рублёў)**.

Наталля Саматыя, складзены пратаколы па ч.1 артыкула 23.34 КаАП, за ўдзел у акцыях у падтрымку незалежнасці 7 і 8 снежня. Суд Маскоўскага раёна, 09.10 (каб. 217). Суддзя - **Лідзія Целіца**. Сведкамі выступаюць супрацоўнікі АМАП **Руслан Кавальчук, Віталь Свецік, Андрэй Штоп і Герасімовіч Раман**. Вынік - **штраф 30 базавых велічынь (765 рублёў).**

Акаловіч Д.А., складзены пратакол па ч.1 артыкула 23.34 КаАП. Суд Маскоўскага раёна, 09.10. Суддзя - **Юлія Варакса**.

Лагвінец Алесь, складзены пратакол па ч.1 артыкула 23.34 КаАП. Суд Маскоўскага раёна, 09.10. Суддзя - **Юрый Машкетаў. Вынік - штраф 30 базавых велічынь (765 рублёў).**

Віктар Кавалькоў (айцец Вікенцій), складзены пратакол па частцы 3 артыкула 23.34 КаАП. Суд Маскоўскага раёна, 9.10 (каб.237). Суддзя - **Віктар Казак**.



Вынік - штраф **50 базавых велічынь (1275 рублёў).**

Алена Талстая, складзены пратакол па артыкуле 23.34 КаАП. За ўдзел у акцыях 7 і 8 снежня. Суд Маскоўскага раёна, пачатак у 9.10. Суддзя - **Таццяна Мотыль**. На судзе зачыталі паказанні сведкаў **Масючэнкі, Шантора, Казадоя, Міціна і Ганчаронка**.

Вынік - **5 сутак арышту і 50 базавых штрафу (1275 рублёў).** Талстую арыштавалі ў залі суда. Яна абвясціла галадоўку.



Алену Талстую міліцыя выводзіць з суда. 26 снежня 2019.

Андрэй Войніч, складзены пратакол па частцы 1 артыкула 23.34 КаАП. Суд Маскоўскага раёна, 10.10 (каб. 217). Суддзя - **Лідзія Целіца**. Вынік - штраф **30 базавых велічынь (765 рублёў).**

Шчасная І.В., складзены пратакол па ч.1 артыкула 23.34 КаАП. Суд Маскоўскага раёна, пачатак у 10.10. Суддзя - **Юрый Машкетаў**. Вынік - штраф **30 базавых велічынь (765 рублёў).**

Зміцер Казлоў (блогер Шэры кот),складзены пратакол па частцы 1 артыкула 23.34 КаАП (за ўдзел у акцыі 7 снежня). Суд Маскоўскага раёна, 10.10 (каб. 222).

Зміцер Казакевіч, складзены пратакол па частцы 3 артыкула 23.34 КаАП. Суд Маскоўскага раёна, 10.10 (каб. 135). Суддзя - **Таццяна Мотыль**. Вынік - штраф **50 базавых велічынь (1275 рублёў).**

Кудзік Андрэй, складзены два пратаколы па частцы 1 артыкула 23.34 КаАП. Суд Маскоўскага раёна, 10.10. Суддзя - **Віктар Казак.**

Ілля Дабратвор, складзены пратакол па частцы 1 артыкула 23.34 КаАП. Суд Маскоўскага раёна, 11.00. Суддзя - **Віктар Казак.** Вынік - штраф **30 базавых велічынь (765 рублёў).**

Ігар Лялькоў, складзены пратакол па частцы 1 артыкула 23.34 КаАП. Суд Маскоўскага раёна, 11.00 (каб. 236).

Мікола Бамбіза, складзены пратакол па частцы 1 артыкула 23.34 КаАП. Суд Фрунзенскага раёна, 09.30. Суддзя - **Алена Бушава**. Штраф - **26 б.в. (663 рубля)**

Павел Севярынец, складзены пратакол па частцы 3 артыкула 23.34 КаАП (за заклікі ў інтэрнэце да ўдзелу ў акцыі 7 снежня). Суд Фрунзенскага раёна, 11.00. Суддзя - **А.А. Скуратовіч**. Вынік - штраф **50 базавых велічынь (1275 рублёў).**

Ніна Багінская, складзены пратакол па частцы 3 артыкула 23.34 КаАП . Суд Савецкага раёна, 12.00.

Пётр Папраўка, складзены пратакол па частцы 1 артыкула 23.34 КаАП . Суд Савецкага раёна, 12.00. Суддзя - **Аляксандр Воўк**. Вынік - штраф **20 базавых велічынь (510 рублёў).**

Дзяніс Садоўскі, складзены пратакол па частцы 1 артыкула 23.34 КаАП. Суд Савецкага раёна, 12.20. Вынік - штраф **20 базавых велічынь (510 рублёў).**

Віктар Савіч, складзены пратакол па частцы 1 артыкула 23.34 КаАП. Суд Савецкага раёна, 12.20 (каб. 31).

Вольга Быкоўская, складзены пратакол па частцы 1 артыкула 23.34 КаАП. Суд Савецкага раёна. Вынік - штраф **20 базавых велічынь (510 рублёў).**



Пачынаюцца суды над удзельнікамі акцый за незалежнасць

У бліжэйшыя дні ў Беларусі пачнуцца суды над удзельнікамі масавых акцый у падтрымку незалежнасці, якія адбыліся 7 і 8 снежня.

Навіны ад Spring96.org у Telegram. Падпішыся на наш канал https://t.me/viasna96

Твитнуть





СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ


Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

WWW.GAZETABY.CO




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык

"У мяне ў першы ж дзень на ЦІПе здарыўся прыступ асфіксіі", — былая арыштантка Акрэсціна

"Мы прыдумлялі розныя махінацыі, каб папросту выжыць", — экс-зняволены пра жыццё і працу ў шклоўскай калоніі

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Патрабуем правясці расследаванне па факце смерці Мікалая Клімовіча і адсутнасці належнай медычнай дапамогі ў калоніях

Бацьку і дачку пакаралі "хатняй хіміяй" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Палітзняволенаму Яну Папковічу прысудзілі 4 гады калоніі

Сяржук Сыс – Валянціну Стэфановічу: "Ганаруся табой, тваёй воляй і характарам"

Праваабаронца і валанцёрка "Вясны" Марыя Тарасенка: "Я маю ўнікальную магчымасць падтрымліваць людзей"

"Яго місія ў большым. Яго мэта — нешта дасягнуць і даказаць": вязні шклоўскай калоніі пра Вітольда Ашурка

Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

У Віцебску судзяць арт-менеджэра і музыку Уладзіміра Булайскага

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

